УДК 947.6 «1914/1918» : 355. 48 (100) «1914/1918»

С.С. Рудовіч, дацэнт

# ДЗЕЙНАСЦЬ ПОЛЬСКІХ ДАБРАЧЫННЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ НА БЕЛАРУСІ Ў КАНТЭКСЦЕ ПАЛІТЫКІ ЦАРЫЗМУ ПА ПОЛЬСКІМ ПЫТАННІ Ў ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (ЖНІВЕНЬ 1914 – ЛЮТЫ 1917 Г.)

The article analyses the activity of the Polish charity organizations in Belarus in connection with the tsarist policy regarding the Poles in 1914–1917.

Адной з мэт свайго ўдзелу ў Першай сусветнай вайне Расійская імперыя абвясціла аб'яднанне ўсіх польскіх зямель пад скіпетрам Раманавых. Пад гэтым разумелася адваяванне ў Германіі і Аўстра-Венгрыі і далучэнне да Царства Польскага ўсходняй часткі Пазнаньшчыны, Сілезіі і Заходняй Галіцыі [12, с. 248]. Каб найхутчэй акрэсліць магчымыя тэрытарыяльныя набыткі ў Польшчы без удзелу саюзнікаў па Антанце (у разліку на непрацяглы характар вайны) і забяспечыць лаяльнасць сваіх польскіх падданых, кіраўнічая вярхушка Расіі ўжо 1 жніўня 1914 г. абнародавала ад імя Вярхоўнага галоўнакамандуючага вялікага князя Мікалая Мікалаевіча адозву «Да палякаў». У гэтым дакуменце будучае ўз'яднанне ўсіх частак польскага народа пад пратэктаратам Расіі падавалася як ліквідацыя гістарычнай несправядлівасці, з-за якой «паўтара стагоддзя таму назад жывое цела Польшчы было раздзёрта на кавалкі». Царскія ўлады абяцалі, што адроджаная Польшча будзе «свабоднай у сваёй веры, мове, у самакіраванні» [6, с. 8; 15, с. 132–136]. У некаторых дакументах мясцовай расійскай адміністрацыі палякаў сталі трактаваць як прывілеяваную групу, што знаходзіцца «пад асобай апекай нашай арміі і ўрада» [1, арк. 170 адв.; 13, с. 231, 251].

Царскія ўлады ажыццявілі шэраг крокаў насустрач польскім нацыянальным памкненням, закліканых узмацніць сярод палякаў прарасійскія сімпатыі. Адным з такіх крокаў было стварэнне ў расійскім войску польскіх узброеных фарміраванняў. У канцы 1914 г. на Паўднёва-Заходнім фронце прыступілі да арганізацыі першага польскага легіёна (1-га Пулаўскага). Неўзабаве, аднак, ён быў перафарміраваны ў 1-ю польскую дружыну апалчэння. У верасні 1915 г. пасля ўдзелу ў баях гэтая дружына, а затым і іншыя польскія вайсковыя адзінкі былі пераведзены ў Бабруйск. Восенню 1915 г. пачалося фарміраванне польскай стралковай брыгады рэгулярных войск. 1-ы полк брыгады ствараўся ў Мінску, 2-і – у Маладзечне. У Барысаве фарміраваліся марцірная і дзве лёгкія батарэі. У чэрвені – ліпені 1916 г. брыгада ўдзельнічала ў наступальнай аперацыі расійскага Заходняга фронту пад Баранавічамі, пасля чаго яе перавялі ў распараджэнне камандуючага Паўднёва-Заходнім фронтам А.А. Брусілава [16, с. 160–163; 22, с. 56].

З пачаткам вайны расійскі ўрад паслабіў абмежаванні адносна развіцця польскай культуры. Быў прыняты закон аб увядзенні ў Царстве Польскім гарадскога самакіравання. Гэтым законам, у прыватнасці, дапускалася публічнае выкарыстанне польскай мовы [25, с. 97–106]. Дазвалялася адкрыццё ў Царстве Польскім і па-за яго межамі навучальных устаноў з польскай мовай выкладання [9, 16 кастр., 6 ліст]. Адной з праяў такога курсу стаў дазвол на выданне ў Мінску восенню 1914 г. – праз 9 гадоў пасля падачы адпаведных хадайніцтваў – польскага штотыднёвіка «Nad Swisloczą» («Над Свіслаччу»).

Дэкларуючы аднаўленне «цэлакупнай» самакіруемай Польшчы ў складзе Расійскай імперыі і ажыццяўляючы пэўныя дэманстратыўныя крокі ў дадзеным напрамку, царскія ўлады выразна не абазначылі сваёй пазіцыі адносна яе будучых тэрытарыяльных межаў. У сувязі з гэтым увосень 1914 г. у Пецярбургу, Маскве, Кіеве і Варшаве прайшлі грамадскія дыскусіі па пытанні польска-ўсходнеславянскага размежавання. Асаблівы розгалас атрымала абмеркаванне ў лістападзе 1914 г. на пасяджэнні Таварыства славянскай культуры ў Маскве даклада «Этнаграфічная Польшча», з якім выступіў прадстаўнік польскай ліберальнай грамадскасці Е. Курнатоўскі (адзін з актывістаў масонскай ложы ў

Варшаве). Прааналізаваўшы этнічны склад насельніцтва на ўсход ад Царства Польскага, ён прыйшоў да высновы аб пераважна польскім характары Сакольскага, Беластоцкага і часткі Бельскага паветаў Гродзенскай губерні, якія, на яго думку, «павінны быць далучаны да этнаграфічнай і палітычнай тэрыторыі Царства Польскага». Астатнюю частку Гродзенскай, а таксама Ковенскую, Віленскую і Мінскую губерні дакладчык аднсіў да літоўска-беларускіх, дзе, паводле яго слоў, «барацьба польскага і рускага элементаў» вяла да «штучнага заахвочвання ўтварэння беларускай нацыянальнасці». Нягледзячы на агаворкі, што беларусам (як і іншым этнічным і рэлігійным групам) павінна быць дадзена «права на стварэнне сваёй нацыянальнасці», Е. Курнатоўскі не хаваў скептыцызму адносна перспектыў нацыянальнага самасцвярджэння беларусаў, лічыў «відавочнай» цягу беларусаў-католікаў да Польшчы, а беларусаў-праваслаўных – да Расіі [17, с. 36–45].

Такія развагі выклікалі абвостраную рэакцыю ў беларускім нацыянальным руху, былі ўспрыняты як праект падзелу беларускага народа паміж Польшчай і Расіяй [9, 6 ліст.; 23, с. 149 –150].

На старонках часопіса «Украинская жизнь» з артыкулам «Аб гуманізме і неабачлівасці» выступіў Максім Багдановіч. Ён абвінаваціў прадстаўніка польскай грамадскасці ў нацыянальным эгаізме, жаданні «узмацнення польскага народа шляхам апалячвання двух мільёнаў беларусаў» і ў гатоўнасці русіфікацыяй астатніх беларусаў заплаціць рускаму грамадству «за магчымасць беззабароннай паланізатарскай дзейнасці» [14, с. 92].

Ідэнтычную пазіцыю адносна беларускага адраджэння заняў і мінскі штотыднёвік «Nad Swisloczą». Ужо ў праграмным артыкуле першага нумара рэдакцыя кваліфікавала беларускае пытанне як «хутчэй штучна ўздыманае». Запэўніўшы, быццам не маюць нічога супраць развіцця нацыянальнага самапачуцця сярод беларусаў, выдаўцы часопіса далей заявілі, што будуць аспрэчваць стварэнне «розных нацыянальных фікцый», здольных дэзарыентаваць мясцовых людзей польскай мовы і культуры, унесці ў польскую справу «хаос і сваркі» [11, № 1, с. 2]. Перадавіца аднаго з наступных нумароў цалкам была прысвечана беларускаму пытанню. Значэнне яго для палякаў непасрэдна звязвалася з адозвай Мікалая Мікалаевіча ад 1 жніўня 1914 г., якая паставіла на парадак дня патрэбу вызначыць этнічныя межы Польшчы. Рэдакцыя даводзіла, што палякі ніколі не паланізавалі беларусаў і не збіраюцца гэтага рабіць і надалей. Разам з тым адкрыта заяўлялася пра незацікаўленасць палякаў у поспеху беларускага адраджэння, яно было ахарактарызавана як іх патэнцыяльны вораг. Адначасова штотыднёвік раскрытыкаваў і афіцыйную расійскую палітыку, якая беларусаў «не прызнае як штосьці асобнае і залічвае катэгарычна і безумоўна да агульнай рускай групы» [11, № 5, с. 2–3].

Апошні выпад паслужыў уладам адной з падстаў (поруч з іншымі) для абвінавачвання часопіса ў «шавіністычным духу» і закрыцця яго на шостым нумары «за шкодны накірунак» [3, арк. 26, 33–37].

Тым часам ваенныя дзеянні, напачатку больш-менш абнадзейлівыя для царызму, у 1915 г. прынеслі яму цэлы шэраг паражэнняў і страт. Адступаючы пад націскам германскіх і аўстра-венгерскіх войск, расіяне пакінулі Польшчу, Курляндыю, Літву, заходнюю частку Беларусі. У кастрычніку 1915 г. расійска-нямецкі фронт надоўга стабілізаваўся. На Беларусі ён прайшоў па лініі Дзвінск – Паставы – Смаргонь – Баранавічы – Пінск.

Разам з адступаючай расійскай арміяй вясной – летам 1915 г. на ўсход рушыў велізарны паток бежанцаў. Царскія ўлады, ажыццяўляючы тактыку «выпаленай зямлі», усяляк стымулявалі выезд насельніцтва з раёнаў, да якіх набліжаўся фронт. Паводле падлікаў расійскага даследчыка А.М. Курцава, агульная лічба перамешчаных асобаў у Расіі ў перыяд вайны дасягнула 5 млн. чалавек. Прыведзеныя ім афіцыйныя статыстычныя звесткі сведчаць, што на канец 1916 г. сярод 3,2 млн. «призреваемых» бежанцаў з заходніх правінцый імперыі 58,8% складалі «рускія» (беларусы, украінцы і велікарусы), 15,0% – палякі, 10,0% – латышы, 6,4% – яўрэі, 7,0% – людзі іншых нацыянальнасцяў [18,

с. 140–142]. Сарваныя з абжытых месцаў, пазбаўленыя сталых крыніц існавання, бежанцы (пераважна гэта былі жанчыны, дзеці і старыя) мелі вострую патрэбу ў харчаванні, прадметах першай неабходнасці, медыцынскім абслугоўванні.

У адпаведнасці з законам «Аб забеспячэнні патрэб бежанцаў» ад 30 жніўня 1915 г., пры Міністэрстве ўнутраных спраў была створана Асобая нарада па ўладкаванню бежанцаў, на месцах – адпаведныя губернскія нарады і павятовыя (гарадскія) камітэты. На франтах сфарміравалася сістэма дзяржаўных галоўнаўпаўнаважаных па ўладкаванню бежанцаў. Разам з дзяржаўнымі ўстановамі дабрачынную дапамогу бежанцам аказвалі грамадскія арганізацыі з агульнаімперскім абсягам дзейнасці: Камітэт вялікай княжны Тацціяны Мікалаеўны (Тацціянінскі камітэт), Усерасійскі земскі саюз, Усерасійскі саюз гарадоў, Усерасійскае таварыства апекі над бежанцамі. Адначасова з дазволу ўладаў узнікалі нацыянальныя арганізацыі дапамогі пацярпелым ад вайны: польскія, яўрэйскія, беларускія, літоўскія, латышскія і г. д. Утвараючы такія арганізацыі, маёмасныя эліты і інтэлігенцыя розных этнасаў не толькі стараліся аблегчыць фізічнае існаванне суродзічаў, але і ставілі мэтай захаваць іх этнакультурную ідэнтычнасць як аснову для будучых дзяржаватворчых намаганняў. Аднак размах дзейнасці і ступень уплыву нацыянальных таварыстваў былі вельмі рознымі. Адна з прычын гэтага – крайне няроўныя фінансавыя магчымасці названых арганізацый, што не ў апошнюю чаргу было абумоўлена асаблівасцямі палітыкі царызму адносна розных этнічных супольнасцяў.

Вядома, што з ліпеня 1915 г. па красавік 1917 г. Асобая нарада па справах бежанцаў пры МУС выдаткавала на іх патрэбы 492 625,7 тыс. рублёў. З гэтай сумы 103 091,1 тыс. рублёў атрымалі нацыянальныя арганізацыі. Звяртае на сябе ўвагу, што большая частка (53 396,6 тыс. рублёў) субсідый, якія прызначаліся нацыянальным арганізацыям, была перададзена польскім дабрачынным таварыствам [29, s. 187]. Між тым, з прыведзеных вышэй звестак аб нацыянальным складзе бежанцаў бачна, што ўдзельная вага палякаў была значна ніжэйшай за палову не толькі ў агульнай бежанскай масе, але і сярод «нярускай» часткі гэтай масы (нават калі выключыць з яе разам з велікарусамі таксама беларусаў і ўкраінцаў). Нечакана шчодрыя грашовыя ўліванні царскага ўрада ў арганізацыі, створаныя яго спрадвечнымі антаганістамі – палякамі, нельга трактаваць інакш як праяву палітыкі паддобрывання і паказнога заступніцтва ў дачыненні да гэтага этнасу, прадыктаваную геастратэгічнымі планамі царызму ў вайне. У той жа час, напрыклад, беларускія і ўкраінскія бежанскія арганізацыі былі амаль цалкам пазбаўлены дзяржаўных датацый [7, 30 чэрв.; 5, 3 мая; 14, с. 192; 19, с. 315–316], што таксама мела сваё тлумачэнне: царызм працягваў у гады вайны лінію на максімальнае стрымліванне нацыятворчых тэндэнцый сярод беларусаў і ўкраінцаў, каб не дапусціць разбурэння «агульнарускага» адзінства, якое разглядалася як адна з галоўных падвалін дзяржаўнага адзінства імперыі.

Ад фінансавых, а значыць, і арганізацыйных магчымасцяў нацыянальных дабрачынных згуртаванняў у значнай ступені залежаў характар руху і далейшы лёс бежанцаў розных нацыянальнасцяў. Паводле пазнейшых сведчанняў польскіх актывістаў, царскі ўрад спрабаваў рэалізаваць канцэпцыю паглынання бежанцаў гаспадарчым арганізмам імперыі шляхам каланізацыі апошнімі малазаселеных тэрыторый на ўсходзе Расіі. Дзеля гэтага агенты перасяленчых устаноў на чыгуначных вузлах (у Баранавічах, Мінску, Бабруйску і г. д.) схілялі бежанцаў да продажу коней і фурманак і перасаджвання на цягнікі, якія накіроўваліся ўглыб імперыі. У процівагу гэтаму польскія камітэты і каталіцкае духавенства агітавалі бежанцаў не прадаваць маёмасць, збочваць з трактаў і імкнуцца асесці кампактнымі групамі як найбліжэй да сваёй радзімы, г. зн. пераважна ў Мінскай, Магілёўскай, Смаленскай губернях [28, s. 62–63, 82–83; 30, s. 235–255]. Пры гэтым кіраўнікі польскіх арганізацый улічвалі наяўнасць сярод насельніцтва на дадзенай тэрыторыі значнага працэнта палякаў, у якіх спадзяваліся знайсці матэрыяльную падтрымку для высяленцаў з Польшчы, працоўныя месцы для іх у мясцовых маёнтках, на

прадпрыемствах і г. д. Не скідвалася з рахунку і верагоднасць набыцця тут выхадцамі з Царства Польскага зямельнай уласнасці (якая была ў 3–4 разы таннейшай, чым у Польшчы), сталага пасялення іх у беларускіх губернях і ўзмацнення такім чынам тут польскага элемента [26, s. 111, 247, 381–382].

Намаганні польскіх актывістаў затрымаць бежанцаў-палякаў на беларускай і прылеглых тэрыторыях мелі пэўны плён. Нягледзячы на існуючы разнабой у лічбах, бачна, што з прыблізна 1 млн. бежанцаў-палякаў найбольшая іх колькасць асела ў Мінскай губерні (100–120 тыс.), другое месца па гэтым паказчыку заняла Магілёўская губерня (75–95 тыс.), затым ішлі Екацярынаслаўская (68 тыс.), Петраградская (66 тыс.), Кіеўская (57,5 тыс.), Маскоўская (39 тыс.), Харкаўская (36 тыс.), Смаленская (26,8–27,5 тыс.), Чарнігаўская (20–25 тыс.), Віцебская (23,5 тыс.) і іншыя губерні імперыі [26, s. 110, 119; 27, s. 26–27].

Беларускія (і украінскія) сяляне, што апынуліся ў бежанстве, былі пазбаўлены апекі моцных нацыянальных згуртаванняў і вызначаліся значнай дэзарганізаванасцю. Калі верыць польскім назіральнікам, яны ўяўлялі сабой «толькі сляпы, роспачны тлум», лягчэй паддаваліся казённай агітацыі і сотнямі тысяч рушылі ў цэнтральныя губерні Расіі, Паволжа, Сібір [28, s. 61–63, 65; 30 s. 235, 237–238, 240, 248]. Сапраўды, паводле даных сучасных айчынных гісторыкаў, бежанцы-беларусы (якіх налічвалася 1,1–1,3 млн.) былі больш распыленыя па расійскіх прасторах: найбольш іх апынулася ў Маскве, Петраградзе, Тамбоўскай, Самарскай, Саратаўскай, Калужскай, Казанскай, Уфімскай губернях [20, s. 19; 24, с. 57].

Высяленцы з Царства Польскага знаходзіліся ў беларускіх і іншых губернях Расійскай імперыі пад патранажам некалькіх польскіх дабрачынных арганізацый.

Ужо ў жніўні 1914 г. у Петраградзе было заснавана Польскае таварыства дапамогі ахвярам вайны (ПТДАВ). Ініцыятыва яго стварэння зыходзіла ад палякаў, якія па розных прычынах пасяліліся ў Расіі (па-за межамі Царства Польскага) задоўга да вайны, – г. зв. «старой эміграцыі». Галоўны камітэт ПТДАВ узначальваў прамысловец У. Жукоўскі, пасля яго смерці – генерал А. Бабяньскі (старшыні), дэпутат IV Дзяржаўнай думы ад Вільні Г. Свяньціцкі і пробашч парафіі св. Кацярыны ў Петраградзе ксёндз К. Будкевіч (віцэ-старшыні). Неўзабаве па ўсёй Расійскай імперыі ўзніклі мясцовыя аддзелы таварыства, якія карысталіся значнай аўтаноміяй адносна цэнтральных органаў. На 1 лістапада 1916 г. налічвалася 247 мясцовых аддзелаў, з іх больш за 20 – у Беларусі і прыбалтыйскіх губернях [21, с. 77; 28, s. 84].

Найбольшым і самым актыўным быў аддзел ПТДАВ у Мінску, заснаваны ў лістападзе 1914 г. Яго ўзначальваў спачатку Ю. Мачульскі, затым У. Крыньскі. Секцыі Мінскага аддзела, які лічыўся губернскім, дзейнічалі ў Мінскім (Ракаў, Свержань, Самахвалавічы, Койданава, Старое Сяло), Навагрудскім (Дарава, Вольна, маёнтак Чэрніхава-Горнае), Слуцкім (Слуцк, Нясвіж, Капыль, Клецк, Пагост), Барысаўскім (Докшыцы, Зэмбін), Ігуменскім (Узда, Дудзічы), Бабруйскім (Глуск), Мазырскім, Рэчыцкім паветах [1, арк. 80–82; 2, арк. 69–70, 115; 21, с. 77].

На Магілёўшчыне філіі ПТДАВ дзейнічалі ў Магілёве (старшыня М. Абязерскі, таварыш старшыні С. Свайніцкі), Гомелі (Я. Шыкер), Оршы (д-р Вагнер), Рагачове (І. Быкоўская), Сянне (К. Свяцкі), мяст. Лазовіца Клімавіцкага павета (ксёндз К. Андракус), Быхаве, Чэрыкаве [4, арк. 38–40; 21, с. 78]. Апрача таго, у Магілёўскую губерню былі эвакуаваны аддзелы таварыства з Коўна, Панявежыса і Вільні.

У Віцебскай губерні вядомы секцыі таварыства ў Дынабургу, Дзвінску, Рэжыцы, Себежы, Веліжы і Лепелі [21, с. 78].

Сярод крыніц фінансавання Польскага таварыства дапамогі ахвярам вайны значную долю займалі ўрадавыя субсідыі: толькі да сярэдзіны лістапада 1916 г. іх сума склала 13 823,6 тыс. рублёў. Па некалькі соцень тысяч рублёў штомесяц на рахунак таварыства пераводзіў праўрадавы Таццянінскі камітэт [28, s. 87]. Безумоўна, фундатарамі польскіх

філантрапічных арганізацый выступалі таксама мясцовыя магнаты – Радзівілы, Чапскія, Друцкія-Любецкія, Тышкевічы, Вайніловічы, якія лічылі сябе палякамі.

На працягу першага года вайны, пакуль баі ішлі ў Польшчы і Галіцыі, актыўнасць ПТДАВ была скіравана на дапамогу сем'ям палякаў, прызваных у войска, і жыхарам Царства Польскага, пацярпелым ад баявых дзеянняў. З сярэдзіны 1915 г., калі фронт перамясціўся на Беларусь і сюды хлынулі патокі бежанцаў, менавіта яны сталі галоўным аб'ектам клопатаў таварыства. Пры Мінскім аддзеле ПТДАВ у жніўні 1915 г. быў утвораны Камітэт апекі над бежанцамі ў Мінскай губерні ў складзе: Ю. Чапскі (старшыня), Э. Абранпальскі, І. Віткевіч, Ю. Івашкевіч, В. Лапот і інш. Аб напрамках працы Камітэта сведчаць створаныя ім секцыі: шпітальная, раздачы вопраткі, грашовай дапамогі, педагагічная, секцыя прытулкаў. Намаганнямі Камітэта апекі над бежанцамі ў Мінскай губерні былі адкрыты 4 шпіталі, 3 амбулаторыі, 2 васьмікласныя, 2 рамесніцкія і 7 пачатковых школ [26, s. 64]. Разам з Яўрэйскім камітэтам дапамогі ахвярам вайны палякі ўтрымлівалі ў Мінску барак для халерных хворых (разлічаны на 100 чалавек). Пад час руху бежанцаў праз Беларусь у 1915 г. на харчавальных пунктах Польскага таварыства ў Нясвіжы і Мінску штодзённа выдавалася па 2 тыс. абедаў [2, арк. 69–70].

Уражвае размах дзейнасці іншай буйной польскай арганізацыі – Цэнтральнага грамадзянскага камітэта (ЦГК) Царства Польскага. Гэтая ўстанова была заснавана польскімі палітычнымі і гаспадарчымі дзеячамі ў Варшаве ў верасні 1914 г. Афіцыйнай задачай ЦГК абвяшчалася дапамога пацярпеламу ад вайны насельніцтву. У межах гэтай кампетэнцыі рашэнні камітэта прызнаваліся абавязковымі нароўні з пастановамі ўрада. Пад маркай дабрачыннай дзейнасці камітэт аператыўна стварыў разгалінаваную сетку сваіх нізавых аддзелаў. Яны разглядаліся кіраўніцтвам ЦГК як зародкі мясцовага самакіравання палякаў, а цэнтральныя структуры камітэта трактавалі сябе як «маральны ўрад» краю. У Царстве Польскім камітэту было дазволена арганізаваць уласную стражу з «паліцэйска-вартаўнічымі» функцыямі, а таксама грамадзянскія суды [9, 11 вер., 12 снеж.; 28, s. 11–17, 26–27].

Пасля акупацыі Царства Польскага немцамі частка кіраўнікоў ЦГК эвакуавалася на ўсход і разгарнула маштабную працу сярод польскіх бежанцаў у Расіі.

Заснаваную ў жніўні 1915 г. у Петраградзе Галоўную ўправу ЦГК «на чужыне» фармальна ўзначальваў сенатар Дз. Любімаў. Аднак рэальным кіраўніком ЦГК у Расіі з'яўляўся галоўнаўпаўнаважаны камітэта Ул. Грабскі, разам з ім у цэнтральнае кіраўніцтва ўваходзілі польскія дэпутаты Дзяржаўнай думы і Дзяржаўнага Савета Расіі Я. Гарусевіч, Е. Гасьціцкі, Г. Свяньціцкі, К. Скірмунт, грамадскія дзеячы С. Святаполк-Чацвяртынські, С. Вайцяхоўскі, С. Глезмер, А. Лядніцкі, Ул. Велепольскі і інш. У большасці яны рэпрэзентавалі тую частку польскай палітычнай эліты, якая выступала ў час вайны за супрацоўніцтва з царызмам (народных дэмакратаў, Партыю рэальнай палітыкі і г. д.) [26, s. 25–27].

9 верасня 1915 г. міністр унутраных спраў М. Шчарбатаў накіраваў губернатарам і граданачальнікам цыркуляр, у якім прадпісвалася не перашкаджаць дзейнасці ЦГК і аказваць яму ўсялякую дапамогу [26, s. 14].

Да канца 1916 г. ЦГК ахапіў сеткай сваіх арганізацый усю еўрапейскую і азіяцкую Расію. Пад апекай камітэта знаходзілася 333,8 тыс. польскіх бежанцаў, размешчаных у 5 тыс. населеных пунктаў і аб'яднаных у 3054 «партыі» і «калоніі». Апарат ЦГК налічваў больш за 3 тыс. чалавек (упаўнаважаных, інструктараў, праваднікаў «партый» і г. д.) [21, с. 79–80; 26, s. 46].

Да канца лістапада 1917 г. даходы ЦГК склалі 47 643,3 тыс. рублёў, прычым ільвіная доля ў яго фінансаванні (42 942,5 тыс. рублёў) належала субсідыям ад расійскага ўрада і Тацццянінскага камітэта [28, s. 72–76].

Уся тэрыторыя Расіі, дзе знаходзіліся падапечныя камітэта польскія бежанцы, была падзелена на 11 раёнаў, кожны з якіх ахопліваў па некалькі губерняў. На Беларусь

распаўсюджвалася кампетэнцыя Заходняга з цэнтрам у г. Рослаўль Смаленскай губерні (кіраўнік Ю. Дангель), Паўночна-Заходняга з цэнтрам у Магілёве (кіраўнік І. Галера) і Франтавога з цэнтрам у Мінску (кіраўнік А. Свіда) раёнаў ЦГК. Ім падпарадкоўваліся мясцовыя філіі (аддзелы, інструктараты) ЦГК у Крычаве, Рагачове, Гомелі, Чачэрску, Мазыры, Бабруйску, Віцебску, Сянне, Оршы, Шклове, Бялынічах, Быхаве, Прапойску, Чавусах, Талачыне, Мсціславе, Фашчаўцы, Валожыне, Красным, Барысаве, Беразіне, Капылі, Клецку, Новым Свержані, Слуцку, Нясвіжы, Ігумене, Койданаве, Уздзе, Волме, Блоні, Ратамцы, Ракаве і іншых населеных пунктах [26, s. 59–86].

У Мінскай губерні пад апекай ЦГК знаходзілася 60,5 тыс. польскіх бежанцаў, у Магілёўскай – 43,4 тыс., у Віцебскай – ад 7,4 да 11,8 тыс. [26, s. 134, 149]. Камітэт аказваў ім самую разнастайную дапамогу: харчаваннем, адзеннем, пошукамі жылля і працы, лячэннем, арганізоўваў навучанне дзяцей, імкнуўся задаволіць культурныя і рэлігійныя патрэбы бежанцаў. З пачатку эвакуацыі да 1 кастрычніка 1916 г. толькі харчовую дапамогу ад ЦГК атрымалі ў беларускіх, а таксама Смаленскай, Арлоўскай і Чарнігаўскай губернях каля 100 тыс. чалавек. Харчавальны пункт у Слоніме ў жніўні – верасні 1915 г. выдаў каля 18 тыс. абедаў і 214 пудоў сухіх пайкоў, аналагічная ўстанова ў Доўску Рагачоўскага павета да канца верасня 1915 г. размеркавала 14 тыс. абедаў. Харчавальны пункт ЦГК у Бабруйску да 1 кастрычніка 1915 г. выдаў бежанцам прадуктаў агульнай вагой 63,6 тыс. пудоў [26, s. 199, 205–206].

З ЦГК Царства Польскага цесна ўзаемадзейнічалі Польскі камітэт санітарнай дапамогі, Таварыства апекі над помнікамі гісторыі і культуры, іншыя польскія грамадскія згуртаванні.

Скіроўваючы матэрыяльныя сродкі і арганізацыйныя намаганні на фізічнае выратаванне бежанцаў, на стварэнне для іх здавальняючых бытавых умоў, кіраўніцтва ЦГК і іншых польскіх таварыстваў ніколі не выпускала з поля зроку задачу захавання іх «нацыянальнага здароўя» (Ул. Грабскі), прадухілення ад асіміляцыі ў іншаэтнічным атачэнні. Больш за тое, як заўважае польскі даследчык дзейнасці ЦГК у беларускіх губернях М. Кажанёўскі, функцыянеры камітэта спрабавалі ўцягнуць у арбіту свайго ўплыву не толькі выхадцаў з Царства Польскага, але і ўраджэнцаў «усходніх крэсаў» былой Рэчы Паспалітай (літоўцаў, беларусаў, украінцаў), каб сфарміраваць або ўмацаваць у іх пачуццё прыналежнасці да польскага этнасу [26, s. 144].

У найбольшай меры такія памкненні выяўляліся пры арганізацыі школ і прытулкаў для дзяцей. Польскія нацыянальныя арганізацыі спаўна скарысталі дазвол царызму на адкрыццё школ з польскай мовай навучання. Толькі пад эгідай ЦГК у канцы 1916 г. у Мінскай губерні дзейнічала 119 польскіх навучальна-выхаваўчых устаноў для 6,5 тыс. дзяцей, у Магілёўскай – 116 школ і прытулкаў для 5,6 тыс. дзяцей, у Віцебскай – 16 устаноў для 590 дзяцей [21, с. 89].

Паводле архіўных даных, польскія школы і прытулкі былі адкрыты ў гады вайны ў Магілёве, Барысаве, Чавусах, Смалявічах, Глуску, Старых Дарогах, Бабруйску, Нясвіжы, Смілавічах, Уздзе, Блоні, Рудзенску, Ігумене, Лагішыне, Пяршаях і многіх іншых гарадах, мястэчках і вёсках беларускіх губерняў. Як адзначалася ў афіцыйнай перапісцы, «гэтыя школы дзякуючы субсідыям з розных устаноў у матэрыяльных адносінах абсталяваны цудоўна» [1, арк. 227–270; 4, арк. 13–14, 33–36, 55–59].

Польскія школы і дзіцячыя прытулкі (у якіх таксама вялося навучанне) адкрываліся ў Беларусі з дазволу папячыцеля Варшаўскай навучальнай акругі і лічыліся як бы часова эвакуаванымі з Царства Польскага. Інспектары народных вучылішчаў абавязаны былі сачыць, «каб дзеці мясцовых жыхароў не наведвалі гэтых навучальных устаноў і каб навучанне ішло з захаваннем агульных законаў» [4, арк. 22]. Між тым, праведзеная ў Магілёўскай губерні праверка высветліла, што «галоўная задача, пра якую клапоцяцца гэтыя школы, зводзіцца да навучання польскай мове не толькі дзяцей бежанцаў з Царства Польскага, але і дзяцей мясцовых сялян-беларусаў» [4, арк. 13–14]. З розных мясцін

Мінскай губерні таксама паступалі сігналы, што рымска-каталіцкае духавенства пад сцягам навучання дзяцей бежанцаў-палякаў «узмоцнена працуе ў сэнсе апалячвання Заходняга краю» [1, арк. 143–180, 295–299]. Такія акалічнасці вельмі ўстрывожылі мясцовую адміністрацыю. Фактычна ёю быў узяты курс на ліквідацыю ў беларускіх губернях польскіх школ [8, 20 февр.], але падзенне ў лютым – сакавіку 1917 г. царскага рэжыму, відавочна, перашкодзіла ажыццявіць гэты намер.

Такім чынам, гістарычныя факты сведчаць аб прыкметным узмацненні ў гады Першай сусветнай вайны польскай прысутнасці на беларускіх землях. Гэта было звязана як з перамяшчэннем сюды вялікай колькасці бежанцаў з Царства Польскага, так і з пэўнай зменай акцэнтаў у афіцыйным стаўленні царызму да польскай нацыянальнай супольнасці, што паспрыяла пашырэнню прасторы для грамадскай актыўнасці польскай эліты. Пакуль захоўваўся царскі рэжым, яе актыўнасць магла выяўляцца галоўным чынам у непалітычных формах (гуманітарная дапамога ахвярам вайны, спробы культывавання на «крэсах усходніх» польскай мовы і самасвядомасці). Разам з тым гэтая дзейнасць умацоўвала сацыяльна-культурны грунт дляператварэння польскага пытання ў адзін з ключавых фактараў вострай і працяглай палітычнай барацьбы, што разгарнулася на Беларусі пасля падзення ў 1917 г. расійскага царызму.

ЛІТАРАТУРА

1. НГАБ у Мінску. Ф. 295, воп. 1, спр. 8960.
2. Там жа. Ф. 295, воп. 1, спр. 9038.
3. Там жа. Ф. 29, воп. 2, спр. 15951.
4. Там жа. Ф.2001, воп. 1, спр. 2111.
5. Беларускі шлях. – 1918.
6. Вестник Минского губернского земства. – 1914. – № 8.
7. Гоман. – 1918.
8. День. – 1917.
9. Наша ніва. – 1914.
10. Гоман. – 1916.
11. Nad Swisloczą. – 1914.
12. Международные отношения в эпоху империализма: Документы из архивов царского и Временного правительств. 1878–1917 гг. Серия 3. – Т. 6. – Ч.1. – М.; Л., 1935.
13. Еврейская старина. – Т. 10. – Пг., 1918.
14. Багдановіч М. Поўны збор твораў: У 3 т. – Т. 3. – Мн., 1995.
15. Бахтурина А.Ю. Воззвание к полякам 1 августа 1914 г. и его авторы // Вопросы истории. – 1998. – № 8.
16. Белякевич И.И. Из истории создания польских национальных формирований в составе русской армии во время первой мировой войны // Первая мировая война. 1914–1918. – М., 1968.
17. Курнатовский Г. Этнографическая Польша. – М., Б.г.
18. Курцев А.Н. Беженство // Россия и Первая мировая война.– СПб., 1999.
19. Лёсік Я. Творы. – Мн., 1994.
20. Мікалаевіч А. Бежанцы першай сусветнай вайны //Спадчына. – 1994. – № 3.
21. Мондзік М., Кажанёўскі М. Польскія грамадскія ратавальныя арганізацыі ў Беларусі ў часы І святовай вайны // Гістарычны альманах. – Гародня, 2003.
22. Подпрятов Н.В. Национальные меньшинства в борьбе за «честь, достоинство, целостность России...»: Создание и использование национальных формирований в русской армии // Военно-исторический журнал. – 1997. – № 1.
23. Смоліч А. – Сівіцкай Л., 16 ліст. 1914 г. // Скарыніч : Літ.-навук. гадавік. Вып. 2. – Мн., 1993.

24. Стацкевич Н.С. Приговор революции: Крушение антисоветского движения в Белоруссии (1917–1925). – Мн., 1985.
25. Шейнис Д.К. К введению городского самоуправления в Царстве Польском // К еврейскому вопросу в Польше: Сб. статей. – М., 1995.
26. Korzeniowski M. Na wygnańczym szlaku... Działalnosć Centralnego Komitetu Obywatelskiego Kroleswa Polskiego na Bialorusi w latach 1915–1918. – Lublin, 2001.
27. Najdus W. Uchodżcy polscy w Rosji w latach 1917–1919 // Kwartalnik Historyczny. – 1957. – № 6.
28. Polska w czasie wielkiej wojny (1914–1918). T. 2: Historia społeczna. – Warszawa, 1932.
29. Spustek I. Polacy w Piotrogradzie. 1914–1917. – Warszawa, 1966.
30. Wojciechowski S. Mojc wspomnienia. T. 1. – Lwów, Warszawa, [1938].